16.03.2018

Рэспубліка

# Аповесці мінулых гадоў

Наталля Сцяпура

## Па анімацыйных стужках нашай кінастудыі можна праводзіць урокі гісторыі, але такой зацікаўленасці з боку школ пакуль няма

**Больш за дзесяць гадоў «Беларусьфільм» збіраў скарбонку «Аповесці мінулых гадоў». Так называецца анімацыйны праект, прысвечаны гербам беларускіх гарадоў. Усяго трыццаць шэсць займальных кароценькіх сюжэтаў. Днямі кінематаграфісты ўсю калекцыю перадалі ў Нацыянальную бібліятэку. Навошта?**



36 гарадоў Беларусі цяпер маюць анімацыйныя стужкі пра свае гербы.

Беларускія аніматары ніколі не гналіся за рублём, іх працу нельга было назваць камерцыйнай. Яны здымалі не столькі забаўляльныя, колькі пазнавальныя мультфільмы. А часам наогул выключна гісторыка-культурныя і адукацыйныя. «Аповесць мінулых

гадоў» якраз такі выпадак. Першапачатковая ідэя была зняць маленькія стужкі-гісторыі, прысвечаныя ўзнікненню гербоў шасці буйнейшых беларускіх гарадоў, дакладней абласных цэнтраў. Ігар Волчак, якому гэта і прыйшло ў галаву, сквапнічаць не стаў, наадварот, паклікаў на дапамогу калег. У выніку сярод аўтараў такія гучныя прозвішчы, як Аляксандр Ленкін, Міхаіл Тумеля, Ірына Кудзюкова, Уладзімір Пяткевіч. Калі стала зразумела, што шасцю гісторыямі праект не абмяжуецца, вырашылі даць магчымасць заявіць пра сябе і моладзі.

*— Гэты праект стаў пляцоўкай, дзе старэйшае пакаленне працавала поруч з новым. Моладзь прынесла свежы погляд, настрой. У нас была адна складанасць: у некаторых населеных пунктах падобная гісторыя, таму ўзнікала шмат аднолькавых выразаў, сюжэтаў. Разам мы знаходзілі новую фарбу, якая б адрознівала адзін горад ад іншага, —* расказаў Міхаіл Тумеля.

У выніку атрымалася трыццаць з лішнім зусім розных стужак. Розныя не толькі почырк, але і тэхніка. Кожны з кароценькім, але захапляльным сюжэтам. Там не проста аповед пра герб мясцовасці, але і яе гісторыя. Бабруйск, напрыклад, паказаны не як горад баброў, а мястэчка, якое праславілася сваімі майстрамі па нарыхтоўцы дроў: сасну адтуль сплаўлялі для будаўніцтва флоту на Чорным і Балтыйскім морах. А ці ведаеце, што ў назве Быхава і гербе (дзве перакрыжаваныя гарматы на чырвоным фоне) схавана яго гісторыя XVI—XVII стагоддзяў: горад меў славу непрыступнай крэпасці, маўляў, там быў «хоў» (ці хованка) ад захопнікаў. І такія цікавыя факты з «Аповесці мінулых гадоў» можна пералічваць доўга. Чым не ўрок па гісторыі Беларусі для дзяцей?

Але Ігар Волчак не згодны: анімацыя — гэта не толькі для маленькіх, даросламу там таксама ёсць над чым падумаць, пашырыць свой кругагляд. На яго думку, такое мастацтва — духоўная ежа, якая дапамагае быць чалавекам адукаваным і разумным. Дарэчы, пра духоўнасць. Асобныя фільмы цыкла маюць шмат розных узнагарод, у тым ліку замежных фестываляў. Але Аляксандр Ленкін узгадвае «Анімаёўку», дзе работу здымачнай групы ацанілі як сапраўдны скарб і падарылі злітак золата. Як яго падзяліць на ўсіх? Кінематаграфісты вырашылі зрабіць добрую справу і ахвяравалі каштоўны метал на лячэнне хворай дзяўчынкі.

Вось яны якія, нашы аніматары. Яны працуюць для людзей і на карысць краіны. Толькі ёсць адна праблема: іх творы не заўсёды даходзяць да гледача. Таму наладжванне кантактаў з Нацыянальнай бібліятэкай — бясспрэчна разумны крок. Яе дырэктар Раман Матульскі абяцае не проста схаваць «Аповесць мінулых гадоў» у архіў, а забяспечыць да яго такі ж доступ, як да літаратуры. Чаму б не праводзіць тут выязныя ўрокі па гісторыі і краіназнаўству? Вядома ж, гэта думка грэе душу Ігару Волчаку. Але мара ў яго іншая: каб фільмы пра гербы беларускіх гарадоў паказвалі на вялікіх экранах на цэнтральных плошчах і ў метро. Тады не толькі нашы суайчыннікі змогуць бліжэй пазнаёміцца са сваёй гісторыяй, але і замежнікі захопяцца ёю.